ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
09 07 2015 г.

# СТУДЭНЦКАЕ ШЧАСЦЕ — ДАХ НАД ГАЛАВОЙ

## Па найвышэйшым разрадзе...

Першымі сваім жыллём у вёсцы абзавяліся студэнты юрыдычнага факультэта і факультэта міжнародных адносін БДУ. Інтэрнат №11 БДУ ўзводзіла каля тысячы чалавек, у тым ліку на дапамогу былі закліканы і самі студэнты. Ён стаў першым інтэрнатам у нашай краіне, які мае сучасную кватэрную планіроўку.

— У кожным блоку ёсць два пакоі, разлічаныя на пяць чалавек (пакой на два і на тры чалавекі), свая кухня, санвузел і душавая, — расказвае **старшыня Студэнцкага савета інтэрната №4 БДУ Ганна ГАМОРЫНА.** — А ў кожным будынку — свая сталовая, дзе можна танна перакусіць (напрыклад, абед з трох страў каштуе ў межах 15 тысяч), кавярня, медпункт, цэнтры псіхалагічнай службы. Ва ўсіх інтэрнатах ёсць пакоі для самападрыхтоўкі студэнтаў з доступам у інтэрнэт. Гэта вельмі зручна ў час экзаменацыйнай сесіі, бо дазваляе не перашкаджаць сваім суседзям па пакоі. Ёсць пакоі для заняткаў танцамі, ёгай, настольным тэнісам, трэнажорных пакоі для хлопцаў і дзяўчат, а ў інтэрнаце №4 БДУ ёсць нават більярдная. У інтэрнаце Лінгвістычнага ўніверсітэта дзейнічае цэнтр Інстытута Канфуцыя, дзе ўсе ахвотныя могуць вывучаць кітайскую мову і знаёміцца з культурай гэтай краіны. А ў інтэрнаце Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта адзін паверх прыстасаваны для пражывання людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

За жылымі карпусамі размяшчаюцца спартыўны комплекс «Лядовы каток», ёсць стадыён, у прыбудове да інтэрната МДЛУ адкрыўся яслі-сад «Крошкін дом» на 75 месцаў. Першачарговае права на карыстанне яго паслугамі маюць жыхары і работнікі Студэнцкай вёскі. Акрамя таго, на тэрыторыі комплексу размешчаны філіял 33-й студэнцкай палiклінікі, да якой раней даводзілася дабірацца праз увесь горад. Ёсць і бясплатнае стаматалагічнае аддзяленне. Бясспрэчны плюс — наяўнасць паблізу станцыі метро (трапіць у цэнтр горада можна за лічаныя хвіліны), супермаркета, гандлёвага цэнтра і вялікай колькасці крамаў.

**Адкрытым застаецца пытанне аб кампенсацыі за наём жылля іншагароднім навучэнцам.**

Замежным балельшчыкам, якія падчас правядзення леташняга чэмпіянату свету па хакеі пражывалі ў Студэнцкай вёсцы, складана было паверыць, што ўся гэтая інфраструктура была створана менавіта для навучэнскай моладзі...

## Інтэрнат не начлежка

Цікавімся ў Ганны, ці дзейнічае ў інтэрнатах «каменданцкая гадзіна». (Нагадаем, што вясной студэнты мінскіх ВНУ стварылі ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» адкрытую групу «Інтэрнаты 24 гадзіны», дзе размясцілі зварот да міністра адукацыі з заклікам адмяніць абмежаванні на доступ у студэнцкія інтэрнаты ноччу.) Міхаіл Жураўкоў на сустрэчы са студэнцкім актывам прапанаваў, у сваю чаргу, прафсаюзным пярвічкам узяць інтэрнаты пад свой асабісты патранаж і прымаць самы непасрэдны ўдзел у падтрыманні там парадку...

— Каб студэнта не пусцілі ў інтэрнат пасля 23 гадзін, такога яшчэ ў нас не было. Калі ў яго ёсць уважлівая прычына, прапусціць абавязаны. Іншая справа, калі хтосьці вяртаецца ў нецвярозым стане... Пасля 18 гадзін і да раніцы на вахце ў нас дзяжураць прадстаўнікі аператыўнага атрада. Асабіста я лічу, што прапускны рэжым і парадак павінны захоўвацца, — падзялілася сваім меркаваннем Ганна. — Чаму, калі большасць жыхароў інтэрната ўжо адпачываюць, хтосьці будзе вяртацца ў тры гадзіны ночы і перашкаджаць іншым? Аператыўны атрад створаны менавіта для падтрымання ў інтэрнаце правапарадку і садзейнічання ў кантролі за прапускным рэжымам...



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

**ДАВЕДКА**

**У інтэрнатах першай катэгорыі плата за пражыванне складае для студэнтаў ВНУ 1,2 базавай велічыні, у інтэрнатах другой катэгорыі — 0,8 базавай велічыні і трэцяй катэгорыі — 0,4 базавай велічыні.**

— Праца прафсаюзных арганізацый вельмі актыўна праводзіцца ў інтэрнатах усіх ВНУ, — канстатуе **старшыня Каардынацыйнага савета старшыняў прафкамаў навучэнскай моладзі Міхаіл БРЭЙША**, які ўзначальвае прафсаюзную арганізацыю студэнтаў БДЭУ. — Мы ўключаем сваіх прадстаўнікоў ва ўсе ўніверсітэцкія камісіі, дзейнасць якіх закранае пытанні вучэбна-выхаваўчага працэсу і стыпендыяльнага забеспячэння, сацыяльныя і жыллёва-бытавыя пытанні. Маніторым умовы пражывання студэнтаў. Удзяляем у распрацоўцы правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах, палажэнняў аб засяленні студэнтаў у інтэрнаты, у размеркаванні месцаў... Гэта вельмі важна, паколькі 100-працэнтнай забяспечанасці іншагародніх студэнтаў інтэрнатамі няма, напэўна, ні ў адной сталічнай ВНУ. Важным крокам у вырашэнні гэтай праблемы стала будаўніцтва Студэнцкай вёскі, аднак пытанне недахопу месцаў да гэтага часу цалкам не знята з парадку дня.

— Калі Студэнцкая вёска толькі задумвалася, планавалася, што ўдасца ахапіць інтэрнатамі 85% тых, хто мае ў гэтым патрэбу, — паведаміў **намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК.** — Але пакуль што ахоп інтэрнатамі складае ў Мінску 76,4%. Для параўнання: у 2011 годзе гэты паказчык складаў у сталіцы ўсяго 55%. Насамрэч, новыя інтэрнаты будуюцца, але на капітальны рамонт закрываюцца зношаныя будынкі. Я задаюся пытаннем, а ці трэба нам імкнуцца да стапрацэнтнай забяспечанасці студэнтаў месцамі ў інтэрнатах? Лічу, што магчымасць мець месца ў інтэрнаце — нядрэнны стымул для таго, каб студэнты падцягвалі сваю паспяховасць. Дарэчы, у 2008 годзе з сацыяльных стандартаў Балонскага працэсу забяспечанасць жыллём студэнтаў была ўвогуле выключана. Калі браць прыклады іншых краін, то ў Грузіі ўсе інтэрнаты ВНУ аддадзены ў камунальны фонд. У Літве інтэрнаты ўвогуле не запоўнены, паколькі там ніхто не хоча плаціць 100% за камунальныя паслугі і студэнту больш выгадна здымаць кватэру. Студэнцкі інтэрнат — не прыватная гасцініца. Ёсць дысцыпліна і правілы ўнутранага распарадку, якіх трэба прытрымлівацца. Гэта трэба тлумачыць студэнтам, асабліва малодшых курсаў...

## Пытанні і адказы

Сёння маладыя людзі, якія пражываюць у суперсучасных інтэрнатах у Студэнцкай вёсцы і не карыстаюцца ніякімі льготамі, за дах над галавой плацяць штомесяц 216 тысяч рублёў. Сума, асабліва ў параўнанні з коштам арэнды ў сталіцы, зразумела, смешная. Але студэнтаў хвалюе, што кошт пражывання ў інтэрнатах расце хутчэй, чым памер іх стыпендый.

Пытанні выклікае і тое, што ўсё часцей месцы беларусаў у інтэрнатах займаюць замежныя студэнты, колькасць якіх у апошнія гады істотна вырасла. Працэнт заселеных у інтэрнаты замежнікаў больш высокі, чым сярод беларускіх студэнтаў. У Міністэрстве адукацыі тлумачаць, што на гэта ёсць дзве асноўныя прычыны. Першая з іх — абавязковая рэгістрацыя па тэрыторыі нашай краіны. Згодна з законам «Аб прававым становішчы замежных грамадзянаў і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь», адрас рэгістрацыі павінен супадаць з адрасам пражывання. Калі беларускаму студэнту дастаткова зарэгістравацца па адрасе галоўнага навучальнага корпуса, то ў замежнікаў іншая сітуацыя. Другая прычына — бяспека. Першакурснікі, калі прыязджаюць на вучобу, хочуць жыць у інтэрнаце, таму што лічаць гэта больш бяспечным. Акрамя таго, у студэнтаў малодшых курсаў ёсць праблемы ў стасунках, звязаныя са слабым валоданнем рускай мовай.

У некаторых ВНУ колькасць замежнікаў сярод студэнтаў ужо дасягнула 10%, а гэта па словах Віктара Якжыка, мяжа, якую не рэкамендуецца пераходзіць. Да таго ж з прычыны дэмаграфічнай сітуацыі ёсць рэальная пагроза, што праз пяць гадоў студэнцкія інтэрнаты могуць застацца ўвогуле паўпустымі. Але пакуль што тысячы студэнтаў вымушаны самастойна вырашаць праблему з пошукам жылля. Каб часткова змякчыць яе, прафсаюзныя арганізацыі збіраюць і бясплатна прадастаўляюць студэнтам інфармацыю пра адрасы кватэр і пакояў, што здаюцца ў наём.

**Дзякуючы намаганням прафсаюза і бюджэтнікі, і студэнты платнай формы цяпер плацяць аднолькава за пражыванне.**

Адкрытым застаецца пытанне аб кампенсацыі за наём жылля іншагароднім навучэнцам. Сёння студэнтаў, якія скарысталіся гэтай магчымасцю, у кожнай ВНУ можна палічыць на пальцах адной рукі. І сума кампенсацыі несур'ёзная (памер яе складае 3 базавыя велічыні ў Мінску і 2 базавыя велічыні ў іншых населеных пунктах). І ўмовы для яе атрымання амаль невыканальныя, сярод іх — патрабаванне прад'явіць заключаны з гаспадаром жыллёвай плошчы дагавор, на што апошнія ідуць неахвотна. Таму прафсаюз прапануе прыняць рашэнне аб стварэнні рэальна дзейснага механізма кампенсавання выдаткаў па найме жылля іншагароднім навучэнцам. Вырашыць гэтую праблему можна з дапамогай вызвалення ад падаходнага падатку грамадзян, якія здаюць у наём жылыя памяшканні іншагароднім студэнтам і навучэнцам. Такая прэферэнцыя дзейнічае ў дачыненні да тых, хто прадастаўляе жыллё ў арэнду маладым спецыялістам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

*Трыумф найлепшых*

# ЗА ТВОРЧАСЦЮ І ВУЧОБАЙ — ПОСПЕХ!

**Нядаўна Прэзідэнт аб'явіў падзяку групе студэнтаў беларускіх ВНУ. Мы зацікавіліся, а хто ж яны, найлепшыя прадстаўнікі новага пакалення? Пра свае інтарэсы, жыццёвыя перакананні і планы на будучыню нам распавялі трое з узнагароджаных.**

**Студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Анастасія КЛЕПЧА** вучыцца на факультэце традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва па спецыяльнасці «Бальны танец». Дзяўчына родам з Магілёўшчыны, усё жыццё займаецца харэаграфіяй, танец для яе — галоўная цікавасць і штодзённы занятак: трэніроўкі, рэпетыцыі, падрыхтоўка да турніраў...

— Мне падабаецца даносіць да кожнага гледача свае перажыванні, думкі, эмоцыі і ідэі. У класічным танцы я заўсёды захаплялася харызмай Рудольфа Нурыева, пяшчотай і чуллівасцю Маі Плісецкай, у бальным танцы маім эталонам тэхнікі з'яўляецца Джаана Льюіс, жаноцкасці — Ганна Мельнікава, падачы — Карына Смірнофф, — кажа Анастасія.

У планах на будучыню ў дзяўчыны — самарэалізацыя ў якасці выканаўцы бальных танцаў, спартсменкі (Анастасія прадстаўляе нашу краіну на шматлікіх міжнародных танцавальных турнірах), балетмайстра-пастаноўшчыка і выкладчыка танцаў.

— Падзяка Прэзідэнта — гэта, напэўна, пакуль што самая значная падзея ў маім жыцці, якая запомніцца назаўсёды, — лічыць дзяўчына. — Гэта значыць, што мая добрая вучоба, удзел у навуковых канферэнцыях, перамогі на шматлікіх турнірах не засталіся незаўважанымі.

**Студэнтка факультэта беларускай і рускай філалогіі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Вікторыя МЯСЦОВА** родам з Мінска. З чатырох гадоў дзяўчына займалася мастацкай гімнастыкай, гэта сфарміравала яе ўпарты характар. Але пасля атрымання разрада кандыдата ў майстры спорту Вікторыя вырашыла скончыць спартыўную кар'еру і зрабіла ўпор на вучобу.

Цяпер дзяўчына займаецца навукова-даследчай дзейнасцю, сфера яе інтарэсаў — праблемы беларускага літаратуразнаўства. У прыватнасці адной з тэм навуковых публікацый былі асаблівасці дэтэктыўнага жанру ў беларускай літаратуры: ад твораў Уладзіміра Караткевіча да сучасных аўтараў, такіх, як Міраслаў Адамчык ці Тэафілія Сабоцкая (пад гэтым псеўданімам піша група аўтараў). Вікторыя актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці, з'яўляецца стыпендыятам Прэзідэнцкага фонду па падтрымцы таленавітай моладзі.

— Вольны час спрабую праводзіць разнастайна: чытаю кнігі, падарожнічаю, — дзеліцца студэнтка. — Мне падабаецца ў выхадны дзень выправіцца ў паездку па цікавых мясцінах Беларусі, прагуляцца па горадзе, у якім раней не была. Любімыя месцы — палац Румянцавых і Паскевічаў у Гомелі, вуліца Савецкая ў Брэсце, Нясвіж. У найбліжэйшай будучыні планую паступіць у магістратуру. Я хацела б працягваць займацца навуковай дзейнасцю. Сваю вучобу, як і раней, буду сумяшчаць з працай трэнера ў спартыўным клубе.

**Дзмітрый НІКАНОВІЧ — студэнт спецыяльнасці «менеджмент СМІ» Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.** Хлопец нарадзіўся і вырас у Брэсце, з дзяцінства захапляецца музыкай, з'яўляецца лаўрэатам рэспубліканскіх і міжнародных музычных фестываляў і конкурсаў, прадстаўляў БДУ на музычных тэлепраектах. Дзве яго арыгінальныя беларускамоўныя песні — «Ніколі» і «Ключы» — цяпер знаходзяцца ў радыёратацыі.

Не забываецца Дзмітрый і пра вучобу — на яго рахунку ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных навукова-практычных канферэнцыях, публікацыі ў зборніках. Дзякуючы актыўнай даследчай дзейнасці, ён размеркаваўся выкладчыкам у свой інстытут на кафедру гісторыі журналістыкі і менеджменту СМІ, збіраецца працягваць навучанне ў магістратуры.

— Для простага хлопца з Брэста, які калісьці паступіў на журфак, Падзяка Прэзідэнта азначае прызнанне, — кажа Дзмітрый. — Сям'я ганарыцца. Аказалася, што сярод некалькіх тысяч выпускнікоў 50 універсітэтаў краіны на самым высокім узроўні былі адзначаны толькі 15, і я сярод іх. Нечакана і неверагодна прыемна. Перакананы, што ў гэтым заслуга маіх бацькоў і настаўнікаў, якія заўсёды вялі мяне правільнай дарогай. А яшчэ мяне засцерагае мая разумніца і прыгажуня жонка, без якой у мяне б нічога не атрымалася.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*